НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# МІНСК І МІНЧАНЕ: ДЗЕСЯЦЬ СТАГОДДЗЯЎ ГІСТОРЫІ

## Людзі, падзеі, час

*Зборнік навуковых артыкулаў*

Мінск
«Беларуская навука»
2023

УДК
ББК
М

*Серыя заснавана ў 2010 годзе*

У к л а д а л ь н і к
А. А. Мяцельскі

Р э д а к ц ы й н а я  к а л е г і я:
В. Л. Лакіза (галоўны рэдактар), П. А. Трубчык, В. Ф. Голубеў, А. Б. Доўнар, А. М. Літвін, А. А. Мяцельскі

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук, прафесар В. Ф. Голубеў
доктар гістарычных навук, дацэнт С. П. Стрэнкоўскі

*Зборнік падрыхтаваны ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя) падпраграмы «Гісторыя і культура» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч) і Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі А. А. Каваленя) падпраграмы «Гісторыя» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза).*

*Зборнік рэкамендаваны да друку Вучоным саветам Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

**Мінск і мінчане:** дзесяць стагоддзяў гісторыі. Вып. 4: Людзі, падзеі, час: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторы; уклад. А. А. Мяцельскі ; рэдкал.: В. Л. Лакіза [і інш]. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 000 с. : іл.

ISBN

У зборніку змешчаны вынікі археалагічных даследаванняў, даследаванняў, прысвечаных палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай і культурнай гісторыі горада Мінска на працягу X–XX ст.

Адрасуецца вучоным, студэнтам, настаўнікам, краязнаўцам і ўсім тым, хто зацікаўлены ў вывучэнні гісторыі Беларусі.

**УДК**
**ББК**

**ISBN**

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2023
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука» 2023

## ПЕРАЛІК СКАРАЧЭННЯЎ

АВАК – Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов: в 39 т. Вильно, 1865–1915.

ГАРФ – Государственный архив Российской Федерации.

ДАМВ – Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці.

НАРБ – Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (Национальный архив Республики Беларусь).

НГАБ (НИАБ) – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Национальный исторический архив Беларуси).

НИАБ – гл. НГАБ.

ПСЗРИ – Полное собрание законов Российской империи.

ПСРЛ – Полное собрание русских летописей.

РГАЭ – Российский государственный архив экономики.

РГВИА – Российский государственный военно-исторический архив.

РГИА (РДГА) – Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў, Санкт-Пецярбург (Российский государственный исторический архив, Санкт-Петербург).

СУ РСФСР – Собрание Узаконений и Распоряжений Рабоче-Крестьянского Правительства РСФСР.

ЦАМА РФ (ЦАМО РФ) – Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (Центральный архив Министерства обороны Российской Федерации).

AAN – Archiwum Akt Nowych (Архіў новых актаў, Варшава).

AGAD – Archiwum Główne Akt Dawnych (Галоўны архіў старажытных актаў, Варшава).

AR – Archiwum Radziwiłłów (Архіў Радзівілаў), гл. AGAD.

BKUL – Biblioteka Uniwersytecka Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego Jana Pawła II.

B. Czart – Biblioteka Czartoryskich.

BN – Biblioteka Narodowa.

BPP – Biblioteka Polska w Paryżu

LMAVB – Lietuvos Mokslų Akademijos Vrublevskių biblioteka.

LVIA – Lietuvos Vastybes Istorijos Archyvas (Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы, Вільнюс).

NGAB – гл. НГАБ

PSB – Polski Słównik Biograficzny (Польскі біяграфічны слоўнік).

TSK – Towarzystwa Straży Kresowej (Таварыства Аховы Крэсаў), гл. AAN.

# АД УКЛАДАЛЬНІКА

Паважаныя чытачы! Вывучэнне рэгіянальнай гісторыі ўжо стала добрай традыцыяй у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Супрацоўнікі інстытута сумесна з выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, настаўнікамі школ і краязнаўцамі штогод праводзяць рэгіянальныя канферэнцыі па ўсёй нашай краіне, на якіх паведамляюць зацікаўленым аматарам гісторыі роднага краю свае новыя напрацоўкі па гісторыі канкрэтнага рэгіёна. Менавіта такім чынам, дзякуючы захаванню і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны на мясцовым узроўні, якая з'яўляецца неад'ёмнай часткай гісторыі і культуры ўсёй краіны, як на мазаічным палатне ствараецца гістарычная памяць нашай Радзімы, праводзіцца вялікая ідэалагічная работа па фарміраванні патрыятычных пачуццяў – адной з неабходных асноў паспяховага развіцця дзяржавы.

На працягу стагоддзя Мінск з'яўляецца сталіцай дзяржавы. Спачатку гэта была сталіца Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, а з 1991 г. Мінск з'яўляецца сталіцай незалежнай Рэспублікі Беларусь – яе палітычным, адміністрацыйным, гаспадарчым і культурным цэнтрам.

Як і ў іншых гарадах Беларусі ў Мінску таксама праводзяцца рэгіянальныя навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя яго гісторыі. Па выніках гэтых канферэнцый свет ужо убачыў тры выпускі навуковых зборнікаў артыкулаў, у якіх расказваецца пра гісторыю Мінска.

У верасне 2017 г. Інстытут гісторыі НАН Беларусі разам з Мінскім гарвыканкамам правялі чарговую, ужо міжнародную навуковую канферэнцыю, прысвечаную вывучэнню гісторыі Мінска з нагоды 950-годдзя першага згадвання горада ў пісьмовых крыніцах – "Мінск і мінчане: дзесяць старогоддзяў гісторыі (да 950-годдзя горада)".

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел прафесійныя даследчыкі з Мінска і Гродна, Гомеля і Магілёва, Брэста, госці нашай краіны з Масквы, Кракава, Вроцлава, Мюнхена, Пермі, Уладзікаўказа, Данецка, усе тыя, каго цікавяць розныя эпохі з багатай гісторыі старажытнага Мінска і яго наваколляў.

Сёння перад Вамі яшчэ адзін выпуск зборніка навуковых артыкулаў "Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Вып. 4. Людзі, падзеі, час".

Прапанаваны зборнік ахоплівае даволі шырокі храналагічны перыяд з гісторыі Мінска: ад Менскага княства і да канца XX ст. Але большая частка дакладаў адносіцца да перыяду Новага часу і да 50-х гадоў XX ст., што тлума-

чыцца навуковай спецыялізацыяй удзельнікаў канферэнцыі. Шмат артыкулаў закранаюць пытанні сацыяльнай структуры, эканоміку горада і Менскага павета, разглядаюцца пытанні паходжання і дзейнасці мінскай шляхты, іх уклад не толькі ў развіццё горада, але і краіны – Вялікага Княства Літоўскага і Расійскай імперыі.

Не засталіся па-за ўвагай і пытанні канфесійнай гісторыі горада і тыя будаўнічыя працэсы, што адбываліся ў Мінску, як у XIX ст., так і пасля Вялікай Айчыннай вайны. Безумоўна, шэраг артыкулаў закранае жыццё Мінска падчас фашысцкай акупацыі і першых пасляваенных гадоў, калі пачалося яго адраджэнне.

Усе надрукаваныя артыкулы з'яўляюцца неад'емнай часткай багатай і разнастайнай мінуўшчыны Мінска і яго наваколляў, якую мы павінны шанаваць і памятаць, у якой павінны вучыцца.

Прапанаваны зборнік навуковых артыкулаў па гісторыі Мінска будзе яшчэ адной цаглінкай у падмурку той манаграфіі па гісторыі сталіцы нашай дзяржавы, якую сумеснымі намаганнямі з археолагамі і гісторыкамі ўсёй краіны плануюць падрыхтаваць і выдаць у Інстытуце гісторыі.

*А. А. Мяцельскі*

тать план о создании постоянной Комиссии при Мингорисполкоме, которая бы занималась этой проблемой[1].

Важное значение в работе женотдела занимали вопросы ликвидации неграмотности среди женщин. Практически на каждом заседании при Минском ГК КП(б)Б слушались вопросы, связанные с этой проблемой. Например, в феврале 1924 г. на заседании Минского женотдела отмечалось, что «все неграмотные делегатки были обязаны посещать школы грамотности». Кроме того, в протоколе этого заседания указывалось, что женщины делегатки должны организовывать подписку на журналы, быть рабкорами, освещать свою работу и жизнь своего предприятия и вообще быть примером для других работниц[2].

Подводя итоги деятельности женотдела при Минском ГК КП(б)Б, делегатских собраний, можно сделать вывод, что они подготовили немало специалистов, прежде всего в сфере просвещения, охраны материнства и детства и др.

В то же время система делегатства принесла партии большевиков значительную массу женских представителей от городских предприятий и от крестьянства для помощи в пропаганде советской политики среди населения, что способствовало упрочению власти большевиков и некоторым образом – формированию нового государственного устройства.

*А. І. Дзярновіч (Мінск, Беларусь)*

## ПОШУКІ ВОБРАЗАЎ: МІНСКАЯ ВУЛІЦА XVI–XIX СТСТ., ЗМЕНЫ НАЗВАЎ І КІНАСТУЖКА «КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ» 1927 ГОДА

**Кінафэст**

Кінафестываль «Лістапад» у 2013 г. быў адметны паказам першых беларускіх фільмаў, створаных у 1920-х гадах. Усе стужкі гэтых бязгукавых фільмаў студыі «Белдзяржкіно» захоўваюцца ў Дзяржфільмафондзе Расійскай Федэрацыі. Зразумела, той быў некалі Дзяржфільмафондам СССР, які перайшоў да Расіі. У Беларусі ж аўтэнтычных уласных першых стужак няма. Таму і быў адметным паказ гэтых фільмаў у Мінску, бо з'явілася магчымасць пабачыць фільмы, якія дэманстраваліся менавіта са стужак дваццатых гадоў – з усімі іхнымі шурпатасцямі, драпінамі, але і з жывым адчуваннем эпохі, калі гэтыя фільмы былі створаныя.

У лістападзе 2013 г. у Мінск прывезлі стужкі «Кастусь Каліноўскі», «Прастытутка» і «У агні народжаная». Гэтыя нямыя чорна-белыя стужкі дэманстраваліся ў класічным фармаце – пад жывы акампанемент, як тое і адбывалася ў дагукавую эпоху кіно. Фільм «Кастусь Каліноўскі» паказваўся ў жывым му-

[1] НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 603. Л. 119.
[2] Тамсама. Д. 1825. Л. 1.



pawet.net

зычным суправаджэнні Сяргея Пукста, вядомага сваёй сюррэалістычнай стылістыкай.

Што гэта за эпоха? Першае дзесяцігоддзе пераможнай Савецкай улады з НЭПам, беларусізацыяй і індактрынацыяй радыкальнай версіі марксізму. Стужка «Кастусь Каліноўскі» ідэальна ілюструе падобны супярэчлівы палітыка-ідэалагічны мікст.

**Стужка**

Фільм «Кастусь Каліноўскі» быў створаны ў 1927 г. расійскім рэжысёрам Уладзімірам Гардзіным (сапр. Благанраваў) (1877–1965), які зрабіў сабе імя ў кінематографе яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы – з 1913 г. У. Гардзін, актор і рэжысёр тэатра, пачаў працаваць у кіно ў якасці сцэнарыста і пастаноўшчыка[1] (іл. 1). Тое, што для здымкаў беларускага фільма быў запрошаны расійскі рэжысёр, зразумела – у Беларусі ў той час увогуле яшчэ не існавала кінематаграфічнай базы. Было дамоўлена пра часовае сумеснае выкарыстанне магчымасцей Ленінградскай кінафабрыкі. У выніку, у лютым 1927 г. СНК БССР пастанавіў стварыць фабрыку «Белдзяржкіно» ў Ленінградзе ў памяшканні былога тэатра «Крывое люстэрка» (канал Грыбаедава, 90/2) (іл. 2). Беларуская кінастудыя, якая пазней была названая «Савецкая Беларусь», працавала тут да 1939 г. Менавіта на ленінградскай базе «Белдзяржкіно» рэжысёр Гардзін зняў свайго «Кастуся Каліноўскага». Стужка здымалася ў павільёнах, асобныя сцэны – у Паўлаўску і Царскім Сяле[2]. Нямая карціна з расійскамоўнымі цітрамі мела 7 частак (1978 м).



Іл. 1. Рэжысёр стужкі «Кастусь Каліноўскі» Уладзімір Гардзін у ролі князя Вярэйскага ў фільме «Дуброўскі» (1936)

Тут варта будзе адзначыць, што сімвалічнасць кінастужкі «Кастусь Каліноўскі» ўзмацнялася з'яўленнем у 1922 г. польскага фільма «Год 1863» рэжысёра Эдварда Пухальскага. Гэта быў мастацкі маніфэст адноўленай польскай дзяржаўнасці – фільм пачынаўся са сцэны пахавання ахвяр патрыятычнай маніфэстацыі ў Варшаве ў 1861 г., а заканчваўся кадрамі з маршалам Юзафам Пілсудскім, які прымае вайсковы парад на тым самым Пляцы Саскім[3].

Кінастужка «Кастусь Каліноўскі» мае вельмі выразны ідэалагічны пасыл. Галоўны герой стужкі сапраўды з'яўляецца правадыром сялянскага паўстання і ў 1863 г. ён супрацьстаіць як царскім карнікам, так і шляхецкім інсурген-

[1] История белорусского кино / А. В. Красинский [и др.]. Минск: Наука и техника, 1969. С. 55.

[2] *Гардин В. Р.* Воспоминания / при участии Т. Д. Буллах-Гардиной. М.: Госкомиздат, 1952. Т. II. С. 49.

[3] Lubelski Tadeusz. Historia kina polskiego. Twórcy, filmy, konteksty. Katowice: Videograf II, 2009. S. 51.



Іл. 2. Будынак фабрыкі «Белдзяржкіно» ў 1927–1939 гадах (Санкт-Пецярбург, канал Грыбаедава, 90/2)




Іл. 3. Постар фільма «Кастусь Каліноўскі». Злева – Кастусь (акцёр Мікалай Сіманаў), справа – Ядзвіга (Соф'я Магарыл)

там. Паводле фільма, непрыняцце Каліноўскім свайго былога атачэння пераносіцца і на ягонае былое каханне – у прысутнасці паўстанцаў-сялян Кастусь адмаўляецца пазнаць сваю сяброўку Ядзвігу, дачку графа Скірмунта (іл. 3).

Сімвалічны вобраз Кастуся Каліноўскага ствараўся паводле замовы беларускага савецкага кіраўніцтва. Да напісання сцэнарыя фільма быў запрошаны гісторык Ян Віткоўскі (1888–1937), спецыяліст па паўстанні 1863 г.[1] і рэвалюцыйным руху 1860–1870-х гадоў[2]. У рамках праекта па стварэнні стужкі Я. Віткоўскі таксама супрацоўнічаў са сцэнарыстам А. Гольдманам. Рэжысёр У. Гардзін ацэньваў напісаны сцэнарый як вельмі слабы[3] і гэтым самым абгрунтоўваў уласны ўдзел у падрыхтоцы сцэнарыя фільма. У сакавіку 1927 г. загадчык «Белдзяржкіно» А. Галкін пісаў дырэктару вытворчасці М. Крэсіну: «...ад гэтай карціны залежыць жыццё і смерць “Белдзяржкіно”»[4].

Асобныя сцэны фільма вырашаны ў жанры баевіка – з перастрэлкамі і пагонямі, дзеі фільма адбываюцца на фоне прыгожай прыроды і ў атачэнні ціка-

---

[1] 1863 год на Міншчыне / Я. Віткоўскі [і інш.]. Менск, 1927. – 216 с.; *Віткоўскі Ян.* «Зямля і воля» 60-х гадоў і сувязь яе з паўстаньнем 1863 году // Полымя. 1930. № 4. С. 117–143.

[2] *Віткоўскі Ян.* Рэвалюцыйныя гурткі 70-х гг. на Беларусі (Па архіўных матэрыялах) // Полымя. 1929. № 4. С. 110–143; *Віткоўскі Ян.* Паўстанне 1863 года і расійскі рэвалюцыйны рух пачатку 1860 гадоў: Спроба параўнання праграм і дзейнасці паводле падпольных выданняў / Беларус. АН, Польскі сектар. Менск, 1931.

[3] *Гардин В. Р.* Воспоминания. С. 46.

[4] НАРБ. Ф. 246. Воп. 1. Спр. 24. Арк. 133; Унучак А. «Ад гэтай карціны залежыць жыццё і смерць “Белдзяржкіно”...»: гісторыя стварэння мастацкага фільма «Кастусь Каліноўскі» (1927–1928 гг.). // Бел. гіст. часоп. 2015. № 6. С. 30.

вай архітэктуры (але пра апошняе будзе ніжэй) (іл. 4). Больш таго, гэта касцюміраваны фільм – не так ужо і багата часу прайшло ад моманту звяржэння манархічнага рэжыму ў Расіі і ўніформа царскай арміі была яшчэ добра вядомая мастакам і акцёрам. Тут трэба таксама звярнуць увагу на тое, што рэжысёр У. Гардзін сам меў вайсковы досвед – у 1894 г. ён скончыў Кадэцкі корпус, а ў 1896 г. Кіеўскія ваенныя курсы[1].

Акцёрскае ж ядро фільма – гэта сузор'е расійскіх выканаўцаў. У ролі Каліноўскага выступіў Мікалай Сіманаў (іл. 5), панны Ядзвігі – Соф'я Магарыл, пана Старжынскага – Барыс Ліванаў (бацька легендарнага «Шэрлака Холмса» Васіля Ліванава). А Таццяна Булах, якая выконвала ролю Марылі, стала жонкай і сталым памочнікам У. Гардзіна[2]. Ці не найлепш прапісаны ў фільме пер-



Іл. 4. Паўстанцы. Эпізод бою (кадр з фільма «Кастусь Каліноўскі»)



Іл. 5. Кастусь Каліноўскі (акцёр Мікалай Сіманаў) (кадр з фільма «Кастусь Каліноўскі»)

[1] Белорусское кино. Персоналии / сост. О. Нечай. Минск: Ковчег, 2007. С. 39.
[2] *Гардин В. Р.* Воспоминания. С. 48.

санаж – гэта Міхаіл Мураўёў у выкананні акцёра Кандрата Якаўлева[1], які меў фенаменальнае падабенства з Віленскім генерал-губернатарам і вельмі добра ўвайшоў у сваю ролю (іл. 6). Рэжысёр У. Гардзін сам сведчыў, што адмоўныя персанажы атрымаліся больш яскравымі, больш пераканаўчымі і зразумелымі, чым станоўчыя героі фільма[2]. А Кастусь Каліноўскі ў стужцы выглядае вельмі схематычна. Пазнейшыя крытыкі ацэньвалі, што гістарычная роля Каліноўскага была «паказана недастаткова поўна»[3].



Іл. 6. Віленскі генерал-губернатар Міхаіл Мураўеў у выкананна акцёра Кандрата Якаўлева (кадр з фільма «Кастусь Каліноўскі»)

Сам У. Гардзін прызнаваўся ўжо ў пачатку 1950-х гадоў, што ён не быў «аматарам гістарычных тэм і заўжды імкнуўся да сучаснага матэрыялу». Але пасля пэўнага часу роздуму, ён усё ж узяўся за стужку «Кастусь Каліноўскі», бо яго прывабіла тэма «рэвалюцыйнага абуджэння сялянства, магчымасць паказаць шырыню масавый дзеянняў, бурлівы паток падзей, у якім растуць правадыры і шэраговыя ўдзельнікі паўстання»[4].

Зусім нетрывіяльна вырашаны ў фільме эпізод з сабакамі. Гэта даволі вядомы сюжэт – карыкатуры на Міхаіла Мураўёва, дзе ён пададзены якраз у выглядзе сабакі (іл. 7). Відавочна, аўтары фільма «Кастусь Каліноўскі» былі знаёмыя з падобнымі карыкатурамі, бо ўставілі ў стужку сцэну з апрананнем у шляхецкіх сядзібах сабак у мундзіры, якія нагадвалі мундзір генерал-губернатара. Неверагодным чынам стваральнікам фільма ўдалося нават падкрэсліць некаторыя супольныя фізіягнамічныя рысы Мураўёва з гэтымі сабакамі, а таксама з Мураўёвым (іл. 8) у выкананні акцёра Якаўлева.

---

[1] История белорусского кино. С. 58–59.

[2] *Гардин В. Р.* Жизнь и труд артиста. М.: Искусство, 1960. С. 172.

[3] *Красінскі А. В., Смаль В. І., Тарасевіч Г. П.* Беларускае кіно. Кароткі нарыс. Мінск: Выд-ва АН БССР, 1962. С. 42.

[4] *Гардин В. Р.* Воспоминания. С. 44.




Іл. 7. Карыкатура-ўлётка 1898 г. на адкрыццё ў Вільні помніка генерал-губернатару Міхаілу Мураўёву (LVIA, Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў)



Іл. 8. Граф Міхаіл Мікалаевіч Мура’ёў (Віленскі). Папера, літаграфія, 72 × 54,5 см. Літограф Павел Смірноў (Санкт-Пецярбург, Редакция Российской художественной хроники, 1865) (Государственный исторический музей (Москва). Отдел/коллекция: Изобразительные материалы / Печатная графика. Инв. номер: И III 22767. Номер ГИМ: ГИМ 42949/3522. Номер ГК: 33694442)

Пракатны лёс стужкі ў жніўні 1928 г. (выпуск 14.08.1928) у Мінску быў, як вынікае з тагачаснай прэсы, вельмі ўдалым[1]. Праз тыдзень прэса ўжо адзначала: «Мінск не памятае такога поспеху! 2 тыдні поўных збораў, 40 перапоўненых сеансаў. Рэкорд наведвальнасці карціны»[2].

Сімвалізм надалей суправаджаў стужку «Кастусь Каліноўскі». Прэм’еры фільма, як баевіка, адбыліся ў многіх еўрапейскіх краінах, ЗША і Кітае. Але ёсць адзін прыклад палітычна-ідэалагічнага выкарыстання стужкі ў іншай краіне. Захаваліся звесткі, што ў Коўне, «часовай сталіцы» Літоўскай Рэспублікі, падчас дэманстрацыі стужкі была зменена яе канцоўка – пасля сцэны смяротнага пакарання Каліноўскага ішлі кадры дакументальнай хронікі, як прэзідэнт Антанас Смятона прымае вайсковы парад[3]. Нагадаем, што Літоўская Рэспуб-

---

[1] Кастусь Каліноўскі // Рабочий. 1928. 20 авг.

[2] Баланс демонстрации фильма // Рабочий. 1928. 27 авг.

[3] НАРБ. Ф. 246. Воп. 1. Спр. 146. Арк. 1; *Смаль В. І.* На экране – народны герой // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1988. № 1. С. 64.

ліка знаходзілася ў стане вострай канфрантацыі з Польшчай з-за Вільні і Віленскага краю і падобная кінаманіфестацыя мела антыпольскі характар, зважаючы на антышляхецкі пафас фільма «Кастусь Каліноўскі».

**Дзе можна было фільмаваць Вільню?**

У драматургіі фільма адны з найбольш значных месцаў займаюць фінальныя сцэны смяротнага пакарання Каліноўскага (іл. 9). Як вядома, паўстанцкі правадыр быў публічна пакараны ў сакавіку 1864 г. на гандлёвым Лукішскім пляцы ў Вільні. Можна спрачацца пра выдатныя якасці Міхаіла Мураўёва як адміністратара, але нельга не прызнаць паталагічную схільнасць віленскага генерал-губернатара да павешванняў – вядома шмат выракаў ваенна-палявых судоў з вызначэннем пакарання ў якасці ссылкі ці расстрэлаў, якія Мураўёў метадычна замяняў на павешванні. Так і Каліноўскі быў прысуджаны да расстрэлу, а ўжо Мураўёў замяніў гэтае пакаранне на пятлю.



Іл. 9. Пакаранне Кастуся Каліноўскага. На заднім плане – характэрны архітэктурны краявід Верхняга рынку Мінска (кадр з фільма «Кастусь Каліноўскі»)

Але дзе можна было здымаць Вільню ў 1927 г.? Пытанне не пустое. Сама Вільня знаходзілася на польскім баку, а класістычныя царскія прыгарады Санкт-Пецярбурга стылёва не пасавалі да краявіду баракальнага гораду. У самой БССР, на той момант, толькі тры вялікія гарады маглі пасаваць «на ролю» Вільні – пагоркі Віцебска з багатай архітэктурай уніяцкага барока; у пэўным сэнсе, гістарычны цэнтр губернскага Магілёва; а таксама Мінск.

Той, хто крыху знаёмы з гістарычнай тапаграфіяй Мінска, у сцэнах пакарання Каліноўскага адразу пазнае наш горад і нават вызначыць тое месца, дзе была ўсталяваная шыбеніца – Траецкую гару (у той час ужо Парыжскай Камуны), на якой яшчэ не была пабудаваная Опера. З гэтага пагорку мы і бачым асноўныя дамінанты Верхняга рынку (Горада) у Мінску – яшчэ стаіць узар-

ваны ўжо пазней, у 1936 г., Петрапаўлаўскі сабор (перабудаваная ў псеўдарасійскім стылі царква Святога Духа), па цэнтры бачым дзве вежы езуіцкага касцёла (каталіцкай катэдры), а справа ўзвышаюцца вежы касцёла бернардынак (цяпер – кафедральны праваслаўны сабор Сашэсця Святога Духа).

З дакументаў высвятляецца, што здымкі сцэны смяротнага пакарання ў Мінску былі патрабаваннем «Белдзяржкіно», і з выкананнем гэтага патрабавання звязвалася фінансаванне кінавытворчасці для «Совкино» з боку «Белдзяржкіно»[1].

Рэжысёр У. Гардзін прыбыў са здымачнай групай у Беларусь і пазней, у сваіх мемуарах, падзяліўся першымі ўражанямі: «У 1927 годзе Мінск яшчэ не быў тым выдатным найпрыгажэйшым горадам, якім ён стаў пазней. Мутная, крывая, брудная рачулка Свіслач бегла хвалістай паласой. Не радавалі вачэй і вузкія вуліцы з невялікімі ўбогімі дамкамі... Крутых пад'ёмаў у Мінску было вельмі шмат, конікі ў конку ўпрагаліся амаль такія ж старажытныя, як яна сама, і таму мы паспяшаліся забяспечыць сябе машынай і неўзабаве з'ехалі ў вёску»[2].

Самі ж здымкі эпізоду пакарання былі шырока разрэкламаваныя ў прэсе – орган ЦК КП(б)Б «Звезда» ў абвестцы пад выразнай назвай «Чуеш Беларусь!» змясціў заклік да мінчан сабрацца 31 ліпеня 1927 г. на плошчы Парыжскай камуны для ўдзелу ў здымках фінальнай сцэны кінастужкі – «найважнейшага і выключнага паводле сваёй рэвалюцыйнай эмацыйнасці моманту фільма» (іл. 10)[3]. Месцам для гэтага была абраная «найвялікшая і найбольш адпаведная дзеля гэтай мэты плошча імя Парыжскай Камуны (был. Траецкая гара)». Паводле рэпартажу ад 2 жніўня 1927 г. у «Савецкай Беларусі» «на пляцу сабралася каля 500 чал.»[4]. У гэтым жа тэксце напрамую ўказвалася, што Траецкая гара Мінска мусіла была стварыць атмасферу Вільні: «Вось яна, старая Вільня, з сваімі звычаямі, з сваім укладам жыцьця. Той, хто быў у гэтыя хвіліны на пляцу Парыскай Камуны, мог перанесьціся ў далёкія мінулыя часы»[5] (іл. 11).

На смяротнае пакаранне Каліноўскага вывозяць з Пішчалаўскага замка і вязуць далей па крывых вулках старажытнага горада. У адпаведнасці з ідэалагічнай канцэпцыяй фільма жыхары места рэагуюць адпаведна іхняму сацыяльнаму статусу – шляхта, якая паліць файкі на гаўбцах верхніх паверхаў гарадскіх будынкаў, з пагардай адварочваецца ад воза, на якім у кайданах узвышаецца народны герой Кастусь. Габрэі ж мітусліва ў гэты момант замыкаюць свае крамкі на першых паверхах тых жа будынкаў, відавочна,

---

[1] НАРБ. Ф. 246. Воп. 1. Спр. 24. Арк. 214 адв.; Унучак А. «Ад гэтай карціны залежыць жыццё і смерць "Белдзяржкіно"...». С. 32.

[2] Гардин В. Р. Жизнь и труд артиста. С. 170.

[3] «Чуеш Беларусь!» // Звезда. 1927. 29 июля. (№ 171). С. 4; 30 июля. (№ 172). С. 4.

[4] Садоўскі Я. На здымках «Кастуся Каліноўскага» // Савецкая Беларусь. 1927. 2 жн. № 173. С. 4.

[5] Тамсама.


„ЧУЕШ, БЕЛАРУСЬ!“

С ТАКИМИ ПРИЗЫВНЫМИ СЛОВАМИ КАСТУСЯ КАЛИНОВСКОГО
(по сценарию фильма „Кастусь Калиноўскі“)
обращается кино-экспедиция, создающая фильм, ко всему организованному обществу Советской Белоруссии, ко всем сознательным гражданам г. Минска.
Приступлено к с'емке самого важного и исключительного по своей революционной эмоциональности момента фильма
„КАСТУСЬ КАЛИНОВСКИЙ“,
СЦЕНЫ КАЗНИ КАЛИНОВСКОГО.
Местом для этого избрана самая большая и наиболее подходящая для этой цели площадь им. ПАРИЖСКОЙ КОММУНЫ (быв. Троицкая гора).
Кино-экспедиция товарищески просит граждан, желающих принять активное участие в кино-с'емке указанного момента и тем выполнить свой общественно-революционный долг, озаботиться подысканием для себя соответствующих 1860-м годам костюмов, точное описание которых следует ниже.
Будут допущены на площадь одетые лица:
Совершенно недопустимы белые цвета шляп и костюмов.
Лица, явившиеся 31 июля к 11 час. утра на площадь Парижской Коммуны (быв. Троицкая гора) одетыми в костюмы того времени и записанные при пропуске на площадь комиссией, получат амортизационную выплату.
Уполномоченный по картине „Кастусь Калиноўскі“ А. Гринфельд.
Внимание!
ОСТАЛОСЬ 2 ДНЯ!

Іл. 10. Абвестка пра набор масоўкі для здымак сцэны смяротнага пакарання Кастуся Каліноўскага (Звезда, 1927, 29 ліпеня)


На здымках „Кастуся Каліноўскага“.

Якім Садоўскі.

Іл. 11. Рэпартаж Якіма Садоўскага «На здымках “Кастуся Каліноўскага”» (Савецкая Беларусь. 1927, 2 жніўня, № 173. С. 4)

засцерагаючыся пагромаў. Гучыць неверагодна, але ў другой палове дваццатых гадоў практычна ўсе апісаныя рэаліі Мінска яшчэ існавалі – былі крамкі, даўняя забудова, каваныя краты на гаўбцах, габрэі ў крамах… У той час, калі здымалі фільм, дэкарацыі не спатрэбіліся.

Не адразу, але досыць хутка, прыходзіць разуменне таго, дзе ж везлі пад час здымак стужкі воз з Каліноўскім. Гэтая вулка вядома паводле некалькіх ацалелых здымкаў, але зусім не ўяўлася, што існуюць кінематаграфічныя кадры, што яе фільмавалі, калі яна яшчэ захоўвалася ў сваёй цэльнасці.

Мова ідзе пра вуліцу Казьмы і Дзям’яна, ці Казьмадзям’янаўскую, якая ад касцёла кляштара бернардынак (цяперашні праваслаўны кафедральны сабор) спускалася з Верхняга рынку да Нямігі, на Нізкі рынак, заканчваючыся недзе каля Менскага замка. Гэта быў, як па прамой, досыць круты схіл, таму і вуліца была спланаванай не прамой, а з выразнымі закругленнямі і паваротамі – па яе крывой траекторыі вазам і карэтам было прасцей адолець пагорак. У кадрах жа фільма гэтая вулка, якая сапраўды магла б пасаваць да тапаграфіі віленскага Зарэчча, ажывае. Гэта была вельмі маляўнічая вуліца. Сцэны жывой спадчыны Мінска складаюць ці не найбольшае ўражанне ад фільма.

**Вуліца Казьмадзям’янаўская**

Казьмадзям’янаўская злучала Верхні горад (Верхні рынак) і раён Замчышча (Ніжні рынак) (іл. 12). Сваю назву вуліца атрымала ад праваслаўнага, а потым уніяцкага манастыра Св. бяссрэбных Казьмы і Дзям’яна, што некалі знаходзіўся

на пагорку – прыблізна на тым месцы, дзе ў 1633 г. новапрызначаным менскім ваяводам Аляксандрам Слушкам будзе фундаваны кляштар бернардынак[1]. Слушка перайшоў з кальвінства ў каталіцтва, таму фундацыя каталіцкага кляштару ў ягонай ваяводскай сталіцы мела, апроч іншага, сімвалічнае значэнне.



Іл. 12. Вуліца Казьмадзям’янаўская на плане Мінска 1858 г. (фрагмент) (Планъ губернскаго города Минска проэктнаго вида. РГИА. Ф. 1293. Оп. 167. Д. 5. Л. 1; Мінск на старадаўніх картах і планах / І. Андрэеў, В. Андрэева, П. Растоўцаў. Мінск, 2021. С. 106–107)

Але чаму знік манастыр Св. Казьмы і Дзям’яна? Да таго ж, гэта быў вельмі значны ў культурным жыцці манастыр – пры ім дзейнічала школа для дзяцей шляхты і мяшчан з Менска і яго ваколіц. Рэч у тым, што вельмі актыўны менскі архімандрыт Афанасій Пакоста, які паходзіў з віленскага купецтва, вырашыў заснаваць у Менску новы ўніяцкі рэлігійны цэнтр пры царкве Святога Духа, які б склаў канкурэнцыю праваслаўнаму цэнтру пры царкве Св. Апосталаў Пятра і Паўла[2] (на сёння Петрапаўлаўская царква – адзін з са-

[1] *Денисов В. Н.* Площадь Свободы в Минске. Минск: Полымя, 1985. С. 52; *Лісейчыкаў Д. В.* Уніяцкія парафіі Мінска ў XVII–XIX стст. // Нашыя святыні: Матэрыялы міжнар. навук. канф., прысвеч. 500-годдзю Мінск. фарн. касцёла, 225-годдзю Магілёўск. архідыяцэзіі, 220-годдзю Мінскай дыяцэзіі, Мінск, 7 чэрв. 2008 г. Мінск: Выд. В. Хурсік, 2009. С. 138.

[2] *Гіль А.* Архімандрыт менскі Афанасій Пакоста: прыклад актыўнасці ўніяцкага асяроддзя ў ВКЛ пачатку XVII ст. // Бел. гіст. агляд. 2012. Т. 19, сш. 1–2. С. 93–107.

мых старажытных з ацалелых гістарычных будынкаў Мінска). Паступова вакол царквы Святога Духа ўзнік сапраўды ўплывовы ўніяцкі асяродак з мужчынскім і жаночым абіцелямі[1]. Знаходжанне побач мужчынскага і жаночага манастыроў вынікала з практыкі манаскага жыцця ўніяцкай царквы ранняга перыяду, якая прадугледжвала суіснаванне абодвух асяродкаў і іх узаемную падтрымку, асабліва ў гаспадарчай і літургічнай сферах. Свята-Духаўскі комплекс узводзіўся на Высокім рынку, зусім побач з манастыром Св. Казьмы і Дзям'яна, таму апошні і заняпаў. Але з тапанімікі Менска гэты манастыр не знік, даўшы назву адной з старажытных вуліц нашага горада.

Манастыр Св. Казьмы і Дзям'яна некалі знаходзіўся на адным канцы вуліцы, а з іншага канца, на Ніжнім рынку, у самым пачатку XVIII ст. быў узведзены кляштар баніфратаў – у 1700 г. падстараста менскі Тэадор Антоні Ваньковіч ахвяраваў баніфратарам 10 тыс. злотых і вялікі пляц для ўзвядзення касцёла, кляштару і шпіталя[2]. Зянон Пазьняк, на падставе натурных і археалагічных даследаванняў, сцвярджаў, што бернардынскі і баніфрацкі кляштарныя комплексы былі злучаны падземным тунелем, якраз пад Казьмадзям'янаўскай[3]. Сама ж даволі невялікая вуліца была вельмі шчыльна забудавана двухі трохпавярховымі дамамі, на першых паверхах якіх размяшчаліся крамы. Найбольш адметныя мураваныя будынкі Казьмадзям'янаўскай вуліцы мелі свае ўласныя назвы, напрыклад, Гіндзейская камяніца. Вось за вялікую колькасць гэтых крамак, што шчыльна занялі ўвесь схіл пагорка, гэты квартал атрымаў сярод менчукоў назву Цёмныя Крамы[4]. Мураваная забудова, якая нам вядомая па здымках пачатку XX ст., паўстала пераважна на працягу XVIII – першай паловы XIX ст. У выніку, сфарміраваўся вельмі цікавы помнік горадабудаўніцтва эпохі Барока і Класіцызму, але трасіроўка вуліцы адсылае нас да яшчэ больш ранніх часоў, калі пасля вялікага пажару 1547 г. пачалося будаўніцтва новага гарадскога цэнтра ўжо на Верхнім рынку. Архаічныя сляды позняй Готыкі і Рэнесенсу мы нават і сёння можам знайсці ў гэтым раёне горада. Казьмадзям'янаўская ж вуліца стала адной з нешматлікіх у Мінску, забудаванай выключна камяніцамі.

Гісторыя Казьмадзям'янаўская вуліцы мае яшчэ адну адметнасць – гэта была першая вуліца Мінска, пераназваная ў гонар Францішка Скарыны. Адбылося тое ў 1926 г. Але ўжо ў 1933 г., у выніку згортвання палітыкі беларусізацыі ёй надалі імя камуністычнага пісьменніка Дзям'яна Беднага (1883–1945). Трэба сказаць, што гэта быў дзіўны выбар, бо яшчэ ў 1930 г. гэты аўтар трапіў у апалу. Нават пралеткультаўцы скардзіліся на «ваяўнічы дылетантызм»

---

[1] *Денисов В. Н.* Площадь Свободы в Минске. С. 40–47.

[2] Кляштар баніфратаў // Кулагін А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыкл. даведнік. 2-е выд. Мінск: БелЭн, 2001. С. 188.

[3] *Пазняк З.* Рэха даўняга часу. Мінск: Народная асвета, 1985. С. 9.

[4] Казьмадзям'янаўскай вуліца // Мінск. Стары і новы / аўт.-склад. У. Г. Валажынскі; пад рэд. З. В. Шыбекі. Мінск: Харвест, 2007. С. 19; Цёмныя крамы // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Мінска: у 4 кн. Мінск: БЕЛТА, 2001. Кн. 1-я. С. 548.



Іл. 13. Вуліца Казьмадзям’янаўская (Францыска Скарыны). Здымак 1931 г.

і «кандовасць» Беднага[1]. Магчыма, для мінскіх савецкіх улад значэнне мела сугучнасць назваў – «Казьмадзям’янаўская» і «Дзям’яна Беднага». Зразумела, і пасля 1926 г. мінчане працягвалі называць вуліцу яе старажытным найменнем – Казьмадзям’янаўская. Калі ж у ліпені 1938 г. Дзям’ян Бедны быў выключаны з УКП(б) з фармулёўкай «за маральнае разлажэнне»[2], аб’екты, якія насілі яго імя, перайменаваныя не былі.

Нягледзячы на ўсе пертурбацыі, да пачатку Другой Сусветнай вайны Казьмадзям’янаўская вуліца захоўвала сваё гістарычнае аблічча і прыцягвала мастацкае вока (іл. 13)[3]. Класічным можна лічыць палатно Анатоля Тычыны (1897–1986) «Стары Мінск. Казьмадзям’янаўская вуліца», выкананае ў 1930 г. (іл. 14)[4]. На карціне быў адлюстраваны самы пачатак вуліцы – ад так званага Малога Гасціннага двара. Праўда, гэтая праца яшчэ з 1960-х гадоў не фігуравала ў спісе асноўных твораў мастака[5], а таксама не ўключалася ў экспанаты персанальных выстаў А. Тычыны[6]. Сёння ж карціна «Стары Мінск. Казьмадзям’янаўская вуліца» выстаўлена ў сталай экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Але адным з першых мастацкіх твораў, прысвечаных Казьмадзям’янаўскай вуліцы, была праца Майсея Сляпяня «Завулак старога Менску» (іл. 15), якая экспанавалася на Першай Усебеларускай мастацкай выставе[7]. Мікола

[1] Гл. падрабязней: Кондаков И. «Басня, так сказать», или «Смерть автора» в литературе сталинской эпохи // Вопр. литературы. 2006. № 1. С. 223–275.

[2] *Соколов Б. В.* Сталин, Булгаков, Мейерхольд… Культура под сенью великого кормчего. М., 2004. С. 101–103; *Сарнов Б. М.* Сталин и писатели. М.: Эксмо, 2008. Кн. 1.

[3] Мінск незнаёмы. 1920–1940 / аўт.-уклад. І. Куркоў. Мінск, 2002. С. 78; Гісторыя Мінска. Мінск: БелЭн, 2006. С. 208.

[4] Горад. Архітэктура. Мы. Да 950-годдзя Мінска. Альбом / склад. К. Ізафатава. Мінск: Маст. літ., 2017. С. 41.

[5] Анатоль Мікалаевіч Тычына / аўтар тэксту П. Герасімовіч. Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1961. С. 64.

[6] Анатоль Мікалаевіч Тычына. Каталог выстаўкі / [прадмова У. Бойкі]. Мінск: Полымя, 1968. С. 16; Тычына А. М. Мой Мінск. Мінск: Белпрынт, 2008.

[7] Каталёг 1-й Ўсебеларускай мастацкай выстаўкі. Менск, 1925. С. 26, № 567 («Завулак у Менску »); *Шчакаціхін М.* Мотывы краязнаўства ў нашым сучасным мастацтве (З вынікаў Усебеларускай Выстаўкі) // Наш край. 1926. № 2–3 (Люты–сакавік). С. 20.



Іл. 14. Анатоль Тычына. Стары Мінск. Казьмадзям’янаўская вуліца. 1930. Палатно, алей. 70,3 × 52,5 см. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь



Іл. 15. Майсей Сляпян. Завулак старога Менску. 1925 (?). Палатно, алей. 54 × 45 см. Паводле: Сучаснае беларускае мастацтва. Праваднік па Аддзеле сучаснага беларускага малярства і разьбярства / апрац. М. Шчакаціхін і В. Ластоўскі. Менск, 1929. С. 27, Табл. № 43

Шчакаціхін называў гэтую працу «барвістай і поўнай сонечнага сьвятла», якая «малюе характэрныя кавалкі яшчэ захаванага да цяперашняга часу старога Менску: ...вузкую загібістую вулацку ў раёне так званага “старога места”»[1]. Стылістычна блізкім да працы Сляпяня быў афорт Барыса Малкіна (1908–1972) «Стары Мінск», створаны ў 1939 г.[2] (іл. 16). І зноў жа, менавіта маляўнічы пачатак вуліцы ад плошчы Свабоды наймацней натхняў мастакоў.

Праз свае старасвецкія рысы гэтая вуліца нават стала ў савецкай прапагандзе сімвалам архаічнасці. Калі ў 1930 г. выйшаў першы нумар часопіса «Чырвоная Беларусь», то для яго цэнтральнага разгароту «Адзінаццаць год БССР – адзінаццаць год пераможнага будаўніцтва» здымкі Мінска падрыхтаваў вядомы фатограф Леў Дашкевіч. Рамантычны здымак вуліцы Казьмадзям’янаўскай, стаўшы класічным, быў суправаджоны наступным подпісам: «Пад ударамі пераможнага социялістычнага

[1] Сучаснае беларускае мастацтва. Праваднік па Аддзеле сучаснага беларускага малярства і разьбярства / апрац. М. Шчакаціхін і В. Ластоўскі. Менск, 1929. С. 27, Табл. № 43. (Тут, відавочна, памылкова ўказана, што праца экспанавалася на 2-й Усебеларускай мастацкай выставе пад № 567.)

[2] Выстаўка твораў мастака Барыса Малкіна: каталог / Саюз мастакоў БССР. Мінск, 1962. С. 6.



Іл. 16. Барыс Малкін. Стары Мінск. Афорт. 1939.
Дзяржаўны музей выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна



Іл. 17. Вул. Казьмадзем’янаўская (Францыска Скарыны). Здымак Льва Дашкевіча (Чырвоная Беларусь. 1930, № 1). Менавіта тут у фільме «Кастусь Каліноўскі» народнага героя везлі на пакаранне

будаўніцтва памірае стары, сярэднявяковы губарнатарска-архірэйскі “город Минск”»[1] (іл. 17).

Вуліца моцна пацярпела падчас нямецкіх бамбаванняў у чэрвені 1941 г., пра што сведчаць і здымкі таго часу[2] (іл. 18–20). Большасць будынкаў вуліцы панесла значныя страты, як і 80 % усяго даваеннага жыллёвага фонду Мінска[3].



Іл. 18. Пашкоджаная забудова Казьмадзям’янаўскай вуліцы (Дзям’яна Беднага).
Здымак Рудольфа Кэслера, чэрвень–ліпень 1941 г. (Bundesarchiv, Bild 101I-137-1008-09A)



Іл. 19. Ацалелая частка Казьмадзям’янаўскай вуліцы (Дзям’яна Беднага). 1941 (?)

[1] Чырвоная Беларусь. 1930. № 1. С. 12.

[2] Bundesarchiv. Bild 101I-137-1008-09A; Bild 141-2020.

[3] Возрожденный из руин. Восстановление и развитие Минска в 1944–1955 гг.: документы и материалы / сост.: В. Д. Селеменев (рук.). Минск: НАРБ, 2017. С. 49, № 17. Справка городской плановой комиссии Минского горисполкома о состоянии жилищного фонда и коммунального хозяйства г. Минска. 12 октября 1944 г.



Іл. 20. Мінск пасля бамбавання. Наперадзе – раён Ніжняга рынку і вуліцы Казьмадзям'янаўскай. Здымак 1941 (1943?) (Bundesarchiv, Bild 141-2020)

Вядома, ступень пашкоджанняў ці разбурэнняў будынкаў можна ацэньваць па-рознаму. У паваенным Мінску больш-менш значныя пашкоджанні будынкаў трактаваліся на карысць іх поўнага знішчэння, а не адбудовы. Усё ж, нават пасля разбору завалаў пасля заканчэння вайны, якая так знявечыла наш горад, ад колішняй Казьмадзям'янаўская засталося тры функцыянальных будынкі[1]. Таксама, афіцыйна захоўваліся адрасы па вуліцы Дзям'яна Беднага – ацалелы трохпавярховы будынак XVIII ст., які сваім фасадам выходзіў на Ніжні рынак (пл. 8 Сакавіка), меў нумарацыю дома № 8 па вул. Дзям'яна Беднага (іл. 21)[2]. Але гэтыя тры апошнія будынкі колішняй Казьмадзям'янаўскай былі канчаткова разбураны ў 1989 г. у сувязі з будаўніцтвам тунелю метро і станцыі «Няміга»[3].

Сёння на месцы старажытнай Казьмадзям'янаўскай вуліцы створаны хвалістыя сходы з сістэмаю пляцовак. Можна меркаваць, што праектыроўшчыкі спрабавалі стварыць асацыяцыі са старой забудовай. Што ж, месца пазначана. Магчыма, мінскія гарадскія ўлады калі-небудзь вернуцца да ідэі аднаўлення структуры адной з самых маляўнічых вулак даўняга Менску.

[1] Гл. фота: *Кірычэнка, Віталь.* Мінск. Гісторыя пасляваеннага аднаўлення. 1944–1952 гг. Мінск: Беларусь, 2004. С. 52, іл. 19; с. 229, іл. 249; *Кірычэнка, Віталь.* Мінск. Гістарычны партрэт горада 1953–1959 гг. Мінск: Беларусь, 2006. С. 146; *Кірычэнка, Віталь.* Мінск. 1960–1969. Дзесяцігадовы шлях сталіцы. Мінск: Беларусь, 2007. С. 74–75.

[2] Мінск учора і сёння / аўт.-склад. В. І. Каляда. Мінск: Беларусь, 1989. С. 208–209, іл. 306 (1950-я гады); *Кірычэнка В.* Мінск. 1960–1969. С. 74–75 (канец 1960-х гадоў); *Чернявская Т. И., Петросова Е. Ю.* Памятники архитектуры Минска XVII – начала XX в. Минск: Наука и техника, 1984. С. 43.

[3] *Жутяев, Юрий.* «Темные крамы» Козмодемьяновской улицы // Вечерний Минск. 2007. 9 апр., № 77 (11338). С. 3.



Іл. 21. Мінск, Верхні горад. Пагорак, па якім праходзіла вуліца Казьмадзям'янаўская (Дзям'яна Беднага) з ацалелымі будынкамі. Здымак 1968 г.

Для нас жа сюжэты з постаццю Каліноўскага, савецкім кінафільмам і старажытнай вуліцай павучальныя – усё ў нашай гісторыі павязана, і калі нехта паспрабуе з яе выкінуць нейкую частку, рызыкуе абваліць увесь дом. Але, прынамсі, наша памяць з гэтым не пагодзіцца.

*А. Г. Дашкевіч (Мінск, Беларусь)*

## ДЗЕЙНАСЦЬ ТАВАРЫСТВА СТРАЖЫ КРЭСОВАЙ НА МІНШЧЫНЕ Ў 1919–1920 гг.

Польская грамадска-палітычная арганізацыя Страж Крэсова (з верасня 1920 г. Таварыства Стражы Крэсовай) была створана 19 лютага 1918 г. у Любліне і дзейнічала да 1927 г. Са студзеня 1919 г. на землях Гродзеншчыны і Брэстчыны функцыянеры Стражы Крэсовай праводзілі нелегальную агітацыйную працу, скіраваную на схіленне сімпатый мясцовага насельніцтва да Польскай дзяржавы, каб папоўніць польскае войска дабраахвотнікамі[1].

З 1 сакавіка 1919 г. дзейнасць арганізацыі афіцыйна пачала распаўсюджвацца на беларускую тэрыторыю, занятую польскімі войскамі. На з'ездзе ў Любліне 14 сакавіка 1919 г. было абрана кіраўніцтва Стражы Крэсовай Усходніх зямель, акрэслены задачы і план дзейнасці арганізацыі. У той жа дзень інструктары з'явіліся ў Ваўкавыскім і Слонімскім паветах. Яны фармальна выконвалі адміністрацыйныя функцыі, з'яўляючыся пасрэднікамі паміж мясцовым насельніцтвам і вайскоўцамі.

---

[1] Zelińska N. Towarzystwo Straży Kresowej, 1918–1927. Lublin, 2006. S. 54–58.

## ЗМЕСТ

**Пералік скарачэнняў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
**Ад укладальніка** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4

**Мінск – цэнтр княства**

*Мароз В. К.* Летапісны Менск/Минск . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
*Кунаш А. А.* Пломба XI–XII стст. з пад'ёмных збораў з левага берага р. Свіслач у Мінску (раён Траецкага прадмесця) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
*Дучыц Л. У., Мядзведзева В. У.* Даследаванне старажытнасцей Мінска і яго акругі (XIX – пачатак XX ст.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19

**Мінск – цэнтр ваяводства**

*Ганецкая І. У.* Царква Святога Духа ў святле археалагічных даследаванняў . . . . 31
*Мартынюк А. В.* «По тамошним масштабам это большой город и замок»: что увидел Сигизмунд Герберштейн на белорусских землях в 1517 и 1526 гг. . . . . . 47
*Шаланда А. І.* Гербавыя пячаткі менскай шляхты на лісце да берасцейскага ваяводы Габрыеля Гарнастая ад 1 красавіка 1587 г. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
*Галубовіч В. У.* Дэпутаты ад Менскага павета ў Трыбунале Вялікага Княства Літоўскага ў час праўлення Уладзіслава Вазы (1633–1648 гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . 56
*Крыцук Р. І.* Грашовы скарб 1661 г. з ляснога масіву з ваколіц мікрараёна Трасцянец (г. Мінск) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
*Skrzypietz A.* Materiały do dziejów rodziny Sobieskich przechowywane w Narodowym Archiwum Historycznym Białorusi w Mińsku . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
*Perłakowski A.* Minsk i województwo Mińskie w sferze interesów podkanclerzego litewskiego Michała Fryderyka Czartoryskiego w latach 1731–1752 . . . . . . . . . . . . . 78
*Пашкевіч У. І.* Люстрацыя млыноў Мінскага ваяводства 1777 г. . . . . . . . . . . . . . . 86
*Сурскі Я. Дз.* Сведчанні па арганізацыі гандлю ў Мінску паводле люстрацыі 1778 г. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90

**Мінск – цэнтр губерніі**

*Филатова Е. Н.* Минский православный архиепископ Михаил Голубович и его повседневная жизнь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
*Готин А. А.* Реконструкция минского Петропавловского собора в первой половине XIX столетия . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
*Кошман В. І., Лаўрык Ю. М.* Лісты да бернардына Піліпа Шчарбінскага: гісторыя знаходкі і характарыстыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
*Антановіч З. В.* Асабовы склад рымска-каталіцкага духавенства Мінскага дэканата ў 1850–1860-х гг. (па матэрыялах ДУ «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі») . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132

*Бурачонак А. В.* Развіццё прадпрымальніцтва ў Мінску ў канцы XIX – пачатку XX ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
*Вавренюк И. И.* Минские иешивы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
*Церашкова К. С.* Мяшчане Мінскай губерні ў 60-я гады XIX – пачатку XX ст.: дынаміка колькасці і крыніцы папаўнення. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
*Грузицкий Ю. Л.* Минское отделение Государственного банка Российской империи (1881–1914) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
*Мяньчэня С. В.* Народныя чайныя Мінска: старонкі гісторыі . . . . . . . . . . . . . . . 181
*Смольянинов М. М.* Минск и Минская губерния в начальный период Первой мировой войны (август 1914 – сентябрь 1915 г.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
*Киселёв Д. Н.* Минск и губерния в годы Первой мировой войны в воспоминаниях последнего минского губернатора князя В. А. Друцкого-Соколинского . . . . . . . 199
*Чикалова И. Р.* Минчанин Исаак Аронович Гурвич (1860–1924): штрихи к научной, политической и личной биографии . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 211
*Шимукович С. Ф.* Реализация благотворительных проектов городской общественностью Минска в конце XIX – начале XX в. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222
*Дубовик А. К.* Из истории регулирования занятости населения в Минске в XX веке . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 232

**Мінск – сталіца БССР і Рэспублікі Беларусь**

*Трацяк І. І.* Беларусізацыя рымска-каталіцкага жыцця ў Мінску ў 1917–1920 гг. 247
*Дубовик Е. А.* Минск – центр профсоюзной жизни БССР в период НЭПа . . . . . . 253
*Барабаш Н. В.* Женотдел Минского ГК КП(б)Б и его участие в общественно-политической жизни города (1921–1930 гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 261
*Дзярновіч А. І.* Пошукі вобразаў: мінская вуліца XVI–XIX стст., змены назваў і кінастужка «Кастусь Каліноўскі» 1927 года . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 265
*Дашкевіч А. Г.* Дзейнасць таварыства Стражы Крэсовай на Міншчыне ў 1919–1920 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 281
*Калясінскі В. Ф.* Жэтоны мінскіх заводаў і фабрык XX ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . 289
*Воронкова И. Ю.* Страницы истории советско-китайских отношений в контексте общественно-политической и культурной жизни Минска 1920–1950-х годов (по материалам белорусских газет) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 294
*Сергачоў С. А.* Крыты рынак на «Віленскім базары» ў Мінску: архітэктура сталіцы пачатку 1930-х гадоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 303
*Старовойтов М. И.* Население Минска в 1939 году: демографический и этносоциальный аспекты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 311
*Лютко С. Г.* Социально-экономическая обстановка в Минске во время немецко-фашистской оккупации в годы Великой Отечественной войны . . . . . . . . . . . . . 327
*Літвін А. М.* Мінск у ліпені 1944 г.: вяртанне статуса сталіцы. . . . . . . . . . . . . . . . 333
*Шарков А. В.* Интернированные немецкие граждане на стройках послевоенного Минска. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 345
*Мазец В. Г.* Узнікненне праблемы перанаселанасці Мінска і спробы яе вырашэння ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 351
*Порозов В. А.* Народная артистка двух государств Клавдия Кузьминична Кудряшова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 359
*Новікаў С. Я.* Ваенна-гістарычная спадчына Мінска і яго ваколіц у міжнародным турызме (на прыкладзе мемарыяльнага комплексу «Трасцянец») . . . . . . . . . . . . 365